# «ЗАРА ВЫЗВАЛЕННЯ ЗАЙМАЕЦЦА НАД БЕЛАРУССЮ»

## Адбылася прэзентацыя новай выставы

**Другая выстава цыкла «Зара вызвалення займаецца над Беларуссю», прымеркаваная да 80-годдзя вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы.**

У кальцавым калідоры трэцяга паверха паступова пачынае выбудоўвацца паўнацэнная дакументальная хроніка вызвалення Беларусі. Другая выстаўка прадстаўляе падзеі са студзеня да сакавіка 1944 года. Тут сабраны факты аб Калінкавіцка-Мазырскай і Рагачоўска-Жлобінскай наступальных аперацыях Беларускага фронту, вынікам якіх стала вызваленне 2 з 10 абласных гарадоў і 36 са 188 раённых цэнтраў, што прыкладна складае 1/5 часткі тэрыторыі Беларусі.

На мерапрыемстве прысутнічалі гісторыкі, журналісты, пісьменнікі, музейшчыкі і нават акцёры.

— Студзень — асаблівы час. Роўна 80 гадоў таму ён пачынаўся з вялікіх чаканняў. Чаканняў хуткай перамогі, чаканняў вызвалення нашай краіны, — заўважыў **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім ГІГІН.**

Ён дадаў, што тыя часы і падзеі ніколі не забудуцца.

— Цяпер таксама непадалёк адбываюцца баявыя дзеянні. Гэта страшна, — адзначыў Вадзім Гігін. — Разам з тым на фоне гэтай трагедыі цыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

— Падзеі Вялікай Айчыннай вайны кожны беларус успрымае асабліва блізка. Асабіста для мяне гэтая справа жыцця, — адзначыў ён. — Мы паднялі тысячы дакументаў, якія ляжалі ў архівах і якія, на жаль, доўгі час былі засакрэчаныя. Тысячы дакументаў вярнуліся ў Беларусь з тых архіваў, якія знаходзяцца ў Расіі.

Таксама на адкрыцці выставы адбылася прэзентацыя двух унікальных выданняў рэдактара аддзела культурнага жыцця газеты «Гомельскія ведамасці» Дзмітрыя Чарняўскага, прысвечаных памяці герояў-вызваліцеляў Беларусі. Першае пад назвай «Баявыя дарогі Рыгора Ільіна, ці 300 дзён на Захад» — гэта мастацкі твор, па якім можна літаральна за адзін вечар атрымаць яскравае ўяўленне пра тое, як адбывалася вызваленне Беларусі ад Камарына да Брэста. З гэтай кнігай звязана цікавая гісторыя. Першапачаткова вобраз галоўнага героя быў зборным, а імя абсалютна выдуманым.

— Прозвішча Ільін было ў рамане Талстога «Вайна і мір», а імя Рыгор я ўзяў з «Ціхага Дона», — прызнаецца аўтар.

Але вось у размове адзін з франтавікоў згадаў у сваім аповедзе нейкага Яўгена Ільіна.

— Мяне зацікавіла тое, што ён быў аднафамільцам майго героя. Я вырашыў знайсці, кім быў у сапраўднасці гэты чалавек, — падзяліўся Дзмітрый Чарняўскі. — Знайшоў яго ўзнагародныя лісты. Аказалася, што ён і ордэн Чырвонай Зоркі атрымаў пад Бабруйскам, і ў фарсіраванні Сожа ўдзельнічаў у 1943 годзе. Атрымліваецца, што ён паўтарыў біяграфію абсалютна выдуманага героя, як быццам той ветэран, які даўно сышоў з жыцця, заявіў аб сабе праз маю кнігу.




Вялікая Айчынная вайна не адыходзіць на другі план. Наадварот, яна застаецца вельмі важным для нас успамінам.

На адкрыцці выставы былі прадстаўлены ўнікальныя дакументы: арыгіналы газет і ўлёткі таго часу. **Дырэктар Нацыянальнага архіва Андрэй ДЗЕМЯНЮК** падкрэсліў, што важна не проста захаваць для сучаснікаў і будучых пакаленняў гэтыя дакументы, але і паказваць іх.

— На выставе прадстаўлена толькі маленькая частка дакументаў аб баявых дзеяннях, партызанскіх фарміраваннях, дакументаў, якія сведчаць аб генацыдзе беларускага народа, — дадаў ён.

На мерапрыемстве таксама прысутнічаў чалавек, які каля 40 гадоў прысвяціў вывучэнню гісторыі тых дзён, — **загадчык цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН доктар гістарычных навук Аляксей ЛІТВІН.** Сёння ён цяпер займаецца навуковым суправаджэннем крымінальнай справы, узбуджанай Генпракуратурай, па фактах гена-

Так і атрымалася, што на вокладцы мы бачым малюнак з фатаграфіі рэальнага чалавека Яўгена Ільіна, што надзяляе яе асаблівай каштоўнасцю.

Над другім выданнем «Вуснамі франтавікоў» аўтар працаваў амаль 10 гадоў. Яму дапамагала 70 фатаграфаў. Гэта фундаментальная журналісцкая праца, якая складаецца з партрэтаў ветэранаў і іх успамінаў.

Фінальным акордам мерапрыемства стала выступленне акцёраў Драматычнага тэатра беларускай Арміі з урыўкам са спектакля «Ты помніш, Алёша...» па п'есе Аляксея Дударава.

***Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.***